В. А. Дайлідка (г. Мінск, Беларусь)

# КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫЯ ВОБРАЗА РАГНЕДЫ Ў БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Полацкая князёўна Рагнеда застаецца ў памяці нашчадкаў як прыклад нязломнасці, мужнасці і чалавечай годнасці. Асноўнай крыніцай звестак пра жыццёвы шлях гордай палачанкі з'яўляецца паданне пра Рагнеду, якое ў літаратурнай апрацоўцы было ўнесена старажытнарускімі кніжнікамі ў летапісныя зводы «Аповесць мінулых часоў». Кароткая летапісная рэдакцыя падання выкладзена на адной старонцы і змяшчае гісторыю сватання Уладзіміра да Рагнеды, паход на Полацк і гвалтоўнае ўзяцце полацкай князёўны ў жонкі. У пашыранай рэдакцыі ў сюжэт уведзены яшчэ адзін герой – дзядзька Уладзіміра Дабрыня, які адыграў у гэтай гісторыі вялікую ролю. Рэдакцыя дапоўнена звесткамі пра далейшы лёс Рагнеды пасля замужжа і заканчваецца выгнаннем яе з сынам на Полаччыну. В. Чамярыцкі зазначае: «…у цэлым не выклікае сумнення гістарычная сапраўднасць апісаных у рэдакцыях падзей, фактаў і ўчынкаў герояў адпаведнасці іх зместу, заснаваным на ўспамінах добра дасведчаных людзей, жыццёвых рэаліях свайго часу» [цыт. па 1, с. 308].

Вобраз Рагнеды ў беларускай літаратуры прадстаўлены творамі «Тры жыцці княгіні Рагнеды» К. Тарасава, «Аповесць пра князёўну Рагнеду» У. Ягоўдзіка, паэмамі «Гарыслава» Я. Купалы, «Палачанка» Л. Багдановіч, «Рагнеда» Т. Бондар, «Выгнанне Рагнеды» А. Вольскага, драматургічнымі творамі «Палачанка» А. Дударава, «Гора і Слава (Русь Кіеўская)» А. Петрашкевіча, «Звон – не малітва» І. Чыгрынава і іншымі.

Паэма Янкі Купалы «Гарыслава» (1912) з'яўляецца першым творам, які адкрыў вобраз Рагнеды для беларускай літаратуры. Я. Купала звяртаецца да вобраза князёўны з мэтай вырашэння праблемы свабоды Бацькаўшчыны: Рагнеда «няскораная, занесла меч над тым, хто зруйнаваў і паланіў яе родную зямлю і выступае сімвалам свабоды ў шырокім сэнсе слова» [2, с. 17], – тлумачыць сітуацыю А. Фількова. Жанчына стала для аўтара сімвалам свабоды чалавека, народа, паэт імкнуўся паказаць прыклад свабодалюбства, на які неабходна арыентавацца, дакараў сваіх сучаснікаў за абыякавасць да лёсу роднай зямлі: *«Забыўся сын аб былўшай хвале, / Ў прыгон прадаў сябе, сям'ю. / Расою здоблючы чырвонай / Свае загоны і лугі, / Прыблуднай чэрні б'е паклоны, / Куе сабе сам ланцугі»* [цыт. па 1, с. 18]. Княская прыналежнасць Купалавай Рагнеды спрыяе фальклорнай рамантызацыі сімваліка-алегарычнага зместу.

Трактоўка вобраза Рагнеды ў п'есе «Гора і Слава (Русь Кіеўская)» (1983) Алеся Петрашкевіча іншая, чым у агульнапрынятай версіі. Рагнеда паўстае не пакутніцай, над якой здзейснілі гвалт, а смелай, рашучай жанчынай, якая перш за ўсё дбае пра святы абавязак перад Радзімай. Вобраз галоўнай гераіні твора фалькларызаваны. А. Петрашкевіч адышоў ад гістарычнай праўды пры апісанні сцэны сватання Рагнеды: паводле версіі аўтара, князёўна дае згоду на шлюб наўгародскаму князю Уладзіміру, але ў ходзе палітычных інтрыг Уладзімір быў падмануты, таму напаў на Рагвалода і захапіў Полацк. Менавіта ў гэты момант Рагнеда стрымлівае эмацыянальнасць, хавае глыбока ў сабе гора, крыўду, сваёй адвагай і гонарам захапляе князя Уладзіміра, заваёўвае яго каханне і аўтарытэт. Тактыка паводзін Рагнеды ў выключнай сітуацыі скіравала ўвагу князя на яе неардынарныя разумовыя здольнасці і выклікала павагу і захапленне, што

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

дазволіла палачанцы заняць месца на троне побач з князем. Рагнеда выступае сябрам і дарадцам мужа: *«Русь нам абаім – маці родная»* [3, с. 338]. У рэмарках-характарыстыках гераіні аўтар выкарыстоўвае слова *«жорсткасць»*, што выяўляецца ў сцэнах прынясення ў ахвяру дзіцяці, у падбухторванні князя Уладзіміра забіць брата. Пад уплывам Рагнеды князь перастае вагацца ў прыняцці новай веры, яна раіць Уладзіміру ўзяць шлюб з сястрой канстанцінопальскага імператара. Складаны працэс хрышчэння Русі таксама адбываецца пад уздзеяннем Гараславы на Уладзіміра: *«Г а р а с л а в а. Новы бог і айцы царквы не толькі благаславяць твой меч, але і пацвердзяць богаўстаноўленасць княжацкай улады, дадуць права караць непаслухмяных і мілаваць добрых, і не па закону продкаў, а па боскаму закону»* [3, с. 338].

Арыгінальны падыход А. Петрашкевіча ў адлюстраванні ўзаемаадносін Гараславы і Уладзіміра: князь моцна кахае жонку, жадае ўзаемнасці ў пачуццях, аддае Гараславе маральную перавагу перад іншымі жанчынамі, яна стала для Уладзіміра своеасаблівым фетышам, што «падмацоўвае», надзяляе рашучасцю, накіроўвае ў дзеяннях: *«У л а дз і м і р. А ты як, Гараслава?! Я не памяняю цябе на ўсіх багоў свету»* [3, с. 340]. У фінале твора Рагнеда-Гараслава пакідае Уладзіміра пасля хрышчэння Русі ў духоўнай безнадзейнасці і сыходзіць на Радзіму, каб прыняць там пострыг. Даследчык П. Васючэнка, аналізуючы аўтарскія рэмаркі і рэплікі персанажаў у гэтай дзеі, мяркуе, што «Рагнеда нарэшце знайшла падставу, каб расквітацца з чалавекам, які забіў яе бацьку і братоў і шлюб з якім яна толькі церпіць» [4, с. 41]. *«Я, як магла, аберагала і цябе, і справы твае. Абяцанні свае таксама стрымала. Цяпер ты стаў сынам богу, я ж, не будучы царыцаю, не хачу рабою быць зямному цару і князю»* [3, с. 347], – гаворыць Рагнеда мужу на развітанне. А. Петрашкевіч стварае вобраз Рагнеды як жанчыны, што вырашае палітычныя, дыпламатычныя, рэлігійныя пытанні, клапоціцца аб стварэнні моцнай цэнтралізаванай дзяржавы, адносіць на другі план усе асабістыя жаданні, шчасце сваё і сваіх дзяцей.

Аповесць К. Тарасава «Тры жыцці княгіні Рагнеды» (1986) дазваляе прасачыць тры ключавыя моманты лёсу Рагнеды, кожны з якіх сімвалічна названы аўтарам асобным «жыццём». У якасці асновы твора пісьменнік выкарыстаў сюжэт «Занатовак…», дадаўшы верагоднае схімніцкае «паланенне» Рагнеды. Рагнеда ўсё сваё жыццё церпіць пакуты, што выступаюць у творы не проста выпрабаваннямі, якія трэба пераадолець, а з'яўляюцца трывалым станам яе душы (*«кожны сам церпіць свае пакуты»* [цыт. па 1, с. 74]).

У сваім першым «жыцці» юная Рагнеда марыць аб шчасці, каханні, але страчвае ўсё па прычыне звадак паміж князямі і адмовы сватам Уладзіміра, які, помсцячы за абразу, знішчыў Полацкае княства і ўвесь род Рагвалода. Другое «жыццё» Рагнеды-Гарыславы пачынаецца дзякуючы пробліску ўспаміну пра завешчаную забітымі родзічамі місію. Паланянка абуджаецца ад бязвольнага існавання: *«І ўвайшла новая душа з раптоўным болем праз сонечны бліск»* [цыт. па 1, с. 48]. Прага помсты і рашэнне забіць ката-мужа бачыцца спакутаванай жанчыне адзіным сродкам ачышчэння ад шасці гадоў бязвольнага жыцця. Даследчыца В. Шынкарэнка, аналізуючы творчасць К. Тарасава, сцвярджае: «Нельга не заўважыць, што мастацкае вырашэнне лёсу ў гістарычных творах К. Тарасава падаецца разам з паглыбленым асэнсаваннем матыву віны. Пры гэтым усведамленне і цяжар апошняй ад здзейсненага героямі-мужчынамі павінны прыняць на сябе і несці замест іх спадарожніцы-жанчыны» [5, с. 81]. Трэцяе

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

«жыццё» Рагнеды-Анастасіі ў якасці схімніцы поўнае разваг, душэўных пакут і перажыванняў: надзея на «адраджэнне» сябе праз сына.

Такім чынам, вобраз Рагнеды ў творах беларускіх аўтараў па вялікім рахунку не супярэчыць летапіснаму вобразу. Жанчына мае абвостранае пачуццё чалавечай годнасці, незалежны, моцны характар. Пісьменнікі, надаючы вобразу Рагнеды разважлівасць, пачуццёвасць, істотна паглыбляюць успрынящце яе асобы чытачамі.

**Літаратура**


1. Бацькаўшчына : зб. гіст. літ. ; уклад., прадм., паслясл. С. Панізніка. – Мінск : Юнацтва, 1999. – 367 с.
2. Фількова, А. «Дачка я волі…»: вобраз Рагнеды ў беларускай літаратуры / А. Фількова // Бацькаўшчына : зб. гіст. літ. – Мінск, 1999. – С. 6–17.
3. На парозе 90-х : літаратурны агляд / М.М. Арочка, П. К. Дзюбайла, С. С. Лаўшук. – Мінск : Нав. і тэхніка, 1993. – 208 с.
4. Васючэнка, П. Сучасная беларуская драматургія : дапам. для настаўнікаў / П. Васючэнка. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 158 с.
5. Шынкарэнка, В.К. Нястомных пошукаў дарога: праблемы паэтыкі сучаснай беларускай гістарычнай прозы / В.К. Шынкарэнка. – Мінск : Беларус. навука, 2002. – 208 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ